ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (1084) ● Чацвер, 20 сакавіка 1975 г. ● Газета выходзіць з 1935 г. ● Цана 2 кап.

МІЖНАРОДНЫ ГОД ЖАНЧЫНЫ

Універсітэцкі калектыў рыхтуе рад мерапрыемстваў, каб адзначыць Міжнародны год жанчыны. Дэканаты і партыйныя арганізацыі факультэтаў правядуць урачыстыя пасяджэнні вучоных саветаў. Для студэнтаў будуць арганізаваны лекцыі, гутаркі, літаратурныя чытанні, прысвечаныя творчасці савецкіх жанчын.

Ва універсітэце адбудуцца сустрэчы з вядомымі жанчынамі — ветэранамі партыі і рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайны, героямі працы, дзеячамі навукі і культуры, перадавікамі вытворчасці.

Стэнды і выстаўкі на факультэтах адлюстроваюць удзел савецкіх жанчын ва усенароднай барацьбе за выкананне рашэнняў XXIV з'езда КПСС, заданняў завяршальнага года дзевятай пяцігодкі.

Асаблівы клопат праяўляе калектыў да жанчын — удзельніц Вялікай Айчыннай вайны.

Наш кар.

НАВУКОВЫЯ ПОСПЕХІ ХІМІКАЎ

Навукова - даследчая работа на хімічным факультэце праводзіцца на 8 кафедрах, у 2 навукова - даследчых лабараторыях і у навукова - даследчых групах, якія выконваюць работу па гасдагаворных тэмах. Кіраўніцтва работай ажыццяўляюць 8 прафесараў і дактароў навук, 82 дацэнты і кандыдаты навук.

Агульная колькасць супрацоўнікаў, якія удзельнічаюць у выкананні навуковых даследаванняў (уключаючы інжынераў, аспірантаў і тэхнікаў), складае каля 300 чалавек. Акрамя таго, у гэтай рабоце удзельнічаюць каля 400 студэнтаў.

Навукова - даследчая работа вядзецца па 56 тэмах, з іх 6 тэм выконваюцца па пастановах ДК СМ СССР па навуцы і тэхніцы, 22 тэмы — па тэматычнаму плану БДУ, 5—кафедральныя і 22 — гасдагаворныя тэмы. Адна тэма мае адносны да праблем вышэйшай адукацыі — «Распрацоука рацыянальнай методыкі выкладання агульнай і неарганічнай хіміі з выкарыстаннем у вучэбным працэсе элементаў праграмiравання».

Эканамічны эфект ад укаранення невялікай часткі гасдагаворных НДР у 1974 годзе склаў 1 млн. 200 тыс. руб.

У 1974 годзе факультэт узнагароджан дыпломам I ступені ВДНГ БССР за дэманстрацыю экспаната «Новыя фатаграфічныя матэрыялы».

Лабараторыі маюць сучаснае абсталяванне, якое дазваляе весці даследаванні на высокім эксперыментальным узроўні. Падтрымліваюцца цесныя навуковыя кантакты з вядучымі ўстановамі краіны. У іх ліку такія прамысловыя прадпрыемствы Беларусі, як ВТА «Інтэграл», завод ЭВМ імя Г. К. Арджанікідзе, завод «Электрапрыбор», Гродзенскі і Полацкі хімкамбінаты, Брэсцкі электралямпавы завод, Магілёўскі завод штучнага валакна, БелНДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі і інш. Частка работ фінансуецца некаторымі з гэтых прадпрыемстваў.

З мэтай павышэння эфектыўнасці і актуальнасці навуковых даследаванняў на факультэце праведзена рэарганізацыя лабараторыі ХРТЭ і радыёхімічнай лабараторыі. Гэтыя лабараторыі замацаваны за кафедрамі неарганічнай і фізічнай хіміі, навуковае кіраўніцтва імі даручана прафесарам В. В. Свірыдаву і А. А. Вечару. Прыведзена у парадак тэматыка даследаванняў у гэтых лабараторыях.

Супрацоўнікі лабараторыі кіруюць курсавымі і дыпломнымі работамі, удзельнічаюць у мадэрнізацыі студэнцкіх практыкумаў і правядзяць вялікую работу па прыцягненню да удзелу у навуковых даследаваннях студэнтаў не толькі старэйшых, але і малодшых курсаў. У рамках аднаго з сектараў радыёхімічнай лабараторыі створана СНДЛ, асноўны навуковы напрамак якой — ачыстка сцёкавых вод прадпрыемстваў цэлюлозна - папяровай прамысловасці з выкарыстаннем іанізуючых выпраменьванняў (кіраўнік доктар хімічных навук Я. П. Пятраеў).

Зауважу, што усе НДР, якія выконваюцца на кафедрах, адпавядаюць профілю выпускаемых спецыялістаў. Так, напрыклад, у сувязі з арганізацыяй у 1970 г. спецыялізацыі «Хімія пауправаднікоу» тэматыка навуковых даследаванняў на кафедрах неарганічнай і фізічнай хіміі расшырылася па праблемах, якія прадстауляюць цікавасць для электроннай і электратэхнічнай прамысловасці. Аналагічным чынам да расшырэння праблем падыходзяць іншыя кафедры.

У 1974 годзе супрацоўнікамі факультэта апублікавана 196 артыкулаў, у Камітэт па справах адкрыццяў і вынаходніцтваў накіравана 34 заяукі на аутарскія пасведчанні, атрымана 16 аутарскіх пасведчанняў. Вялікую дапамогу в пошуку інфармацыі, у патэнтнай працоуцы тэм НДР, а таксама ва укараненні навуковых дасягненняў у народную гаспадарку на прадпрыемствах рэспублікі аказвае кафедрам і лабараторыям факультэта НДА універсітэта. Нельга не сказаць таксама пра пастаянную дапамогу рэктарата ва умацаванні матэрыяльна - тэхнічнай базы факультэта.

Факультэт пастаянна выконвае планы прыёму у аспірантуру. Асноуная маса заканчваючых (75 працэнтау) у час завяршаюць выкананне дысертацыйных тэм. У справаздачным годзе 7 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі, 2 — доктарскія. На кафедрах абмеркаваны доктарскія дысертацыі, падрыхтаваныя С. Сударыкавым, Л. Станішэўскім. Актыуна працуюць над завяршэннем доктарскіх дысертацый Ф. М. Капуцкі, А. І. Чырко, В. А. Лішнеускі, І. І. Пакроускі, В. С. Каральоу.

Ёсць усе падставы лічыць, што навуковая работа на факультэце будзе пастаянна паляпшацца.

Г. БРАНІЦКІ.

ПАДТРЫМЛІВАЕМ ІНІЦЫЯТЫВУ

Універсітэцкі калектыў горача падтрымаў ініцыятыву перадавых маскоускіх прадпрыемстваў правесці 19 красавіка 1975 года камуністычны суботнік, прысвечаны 105-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, азнаменаваць яго ударнай працай, а заробленыя грошы перавесці у фонд дзевятай пяцігодкі.

Партыйны камітэт БДУ прыняў спецыяльную пастанову, у якой намечана праграма работы па падрыхтоуцы да суботніка.

На факультэтах і у структурных падраздзяленнях БДУ праводзяцца гутаркі і палітінфармацыі, прысвечаныя суботніку.

У дзень суботніка намечана правесці урачыстыя мітынгі, выпусціць радыёгазету, «маланкі», баявыя лісткі, якія раскажуць аб тых, хто будзе найлепш працаваць у гэты дзень.

Для арганізацыі і правядзення суботніка створан штаб на чале з прарэктарам С. А. Ерамеевым.

Камсамольскі актыу факультэта. Ён заусёды у гушчыні усіх карысных спраў, заусёды з'яуляецца запявалам усяго новага, цікавага, што праводзіцца ва універсітэце.

Пасля заняткаў я наведала 605-ю аудыторыю галоунага корпуса. Сёння тут мнагалюдна: у 19.00 маюць адбыцца чарговыя заняткі школы камсамольскага актыву гістарычнага факультэта.

Знаёмлюся з рабятамі і задаю пытанне, што цікавага, карыснага для іх у школе камсамольскага актыву.

ШКОЛА ВУЧЫЦЬ, ШКОЛА ДАПАМАГАЕ

Галя Партнова, III курс:

— Тут ты не толькі павышаеш свой культурны узровень, але і вучышся працаваць з людзьмі, разумець іх, правільна весці дакументацыю.

Люда Сямёнава, II курс:

— Заняткі у школе праходзяць вельмі цікава: знаходзішся заусёды у курсе усіх спраў, жывеш інтарэсамі факультэта.

Анатоль Разанаў, камсорг:

— Школа актыву дапамагае авалодаць сакрэтамі камсамольскай работы. Тут можна атрымаць адказы на усе пытанні, якія узніклі у час арганізацыі мерапрыемстваў.

Сяргей Жугін, II курс:

— У нас вельмі часта бываюць кваліфікаваныя лектары, праводзяцца гутаркі, перад камсамольцамі выступаюць ветэраны вайны, ветэраны працы. Вось і нядаўна адбыліся цікавыя сустрэчы са студэнтамі біяфака па абмену вопытам работы, з начальнікам камітэта дзяржаўнай бяспекі.

Удзельнікі школы дзеляцца сваімі думкамі, меркаваннямі з аднакурснікамі, інфармуюць іх па пытаннях, разгледжаных на занятках.

Кіраўнік школы Уладзімір Карагін (II курс) прапанаваў мне:

— Папрысутнічайце на нашых занятках. Многа чаго пачуеце і ўбачыце.

Шчыра кажучы, не вельмі хацелася заставацца, бо ведала, што пачнуцца даклады, «сухія» справаздачы і г. д. Але хацела глыбей зразумець: за што ўсё ж такі любяць школу студэнты-актывісты. І цікавасць перамагла.

— Увага! Увага! — раздаліся пазыуныя спецыяльнага выпуску радыёгазеты. Заняткі пачаліся. Пытанні был арганізацыйнага парадку: аб абмене камсамольскіх дакументаў, аб перыядычным выхадзе факультэцкай газеты «Гісторык», аб мастацкай самадзейнасці і, вядома ж, аб выніках мінулай сесіі. Збоку было відаць, што камсамольскіх важакоу па-сапраўднаму хвалююць справы факультэта, што ім не ўсё роўна, на якім месцы гістфак па паспяховасці, мастацкай самадзейнасці, спорту. Кожны адчувау асабістую адказнасць перад калектывам.

Незауважна праляцелі паутары гадзіны.

Паволі крочу з Уладзімірам Карагіным па калідоры.

— У чым прычына цікавасці заняткаў? Мы шукаем разнастайныя формы работы са студэнтамі-актывістамі. Звычайна заняткі праходзяць у двух аспектах. Сёння мы вырашалі арганізацыйныя пытанні, абмяркоўвалі план абмену камсамольскіх дакументаў. Другі аспект—гэта правядзенне вечароў, сустрэч. Мы часта праводзім такія цікавыя мерапрыемствы.

Школа мае пэўную мэту. Пасля навучання—студэнт у курсе многіх спраў, ён можа без асаблівых цяжкасцей працаваць групкамсоргам, праоргам і г. д. Актывістамі становяцца не усе. Таму наша задача—выявіць арганізатарскія здольнасці чалавека, дапамагчы іх развіццю.

— Напэўна, пасля навучання камсамольцы здаюць своеасаблівы экзамен?

— Сапрауды. У канцы года у нас плануецца правядзенне атэстацыі усіх слухачоў. Мы стараемся дабіцца, каб яны былі выдатнымі спецыялістамі з высокім культурным узроунем, каб добра ведалі асновы масава-палітычнай работы. Мы строга кантралюем эфектыунасць работы.

— І, калі ласка, некалькі слоу пра газету, якая прагучала у пачатку заняткаў.

— Газету сталі выпускаць у нашым СБА імя Ленінскага камсамола. Паступова гэта увайшло ў прывычку. Сёння прагучау спецыяльны выпуск радыёгазеты пад назвай «Эстафета пакаленняў»—аб гісторыі камсамола з першых дзён заснавання. Звычайна ж тэмы для перадач мы знаходзім у жыцці факультэта. Газета з'яуляецца нязменным нашым памочнікам у школе камсамольскага актыву.

Л. БАРАН,
студэнтка журфака.

Непрыкметна праляцелі для сённяшніх выпускніковай студэнцкія гады. І вось надышло размеркаванне. Адным з першых ва універсітэце атрымалі накіраванні на працу пяцікурснікі геаграфічнага факультэта. Упершыню да месца прызначэння — у саветы па турызму Брэста, Гомеля, Салігорска, Оршы, Гродна і іншых гарадоў нашай рэспублікі паедуць юнакі і дзяучаты, што спецыялізаваліся па турызму і краязнауству. Іншыя студэнты размеркаваны у навукова-даследчыя інстытуты, на тапографа-картаграфічныя прадпрыемствы і у школы.

Фота С. ДЗЕЯНКОВА.

ШЭСЦЬ ОРДЭНАЎ НА ТВАІМ КАМСАМОЛЬСКІМ БІЛЕЦЕ

У БАЯХ ЗА ЎЛАДУ САВЕТАЎ

Камсамол узнік у суровы, грозны час. З першых дзён існавання загартоўваўся ён у полымі баёў за маладую Савецкую уладу. Бо нездарма урачыстай клятвай моладзі прагучала прынятая у 1918 годзе на I з'ездзе РКСМ рэзалюцыя па бягучаму моманту: «Сусветная контррэвалюцыя... знойдзе у нашым асяроддзі дастатковы адпор. Увесь свой рэвалюцыйны запал, усе свае маладыя сілы мы аддадзім на барацьбу з ёй... Набліжаецца апошні і рашаючы бой. Ні кроку назад! Няхай жыве Савецкая улада!»

Вернасць сваёй клятве члены Камуністычнага Саюза Моладзі даказалі справай.

Вясной 1919 года, калі Калчак, захапіушы Сібір, пагражаў паходам на Маскву, камсамол правёў першую усерасійскую мабілізацыю на Усходні фронт. Восенню таго ж года для барацьбы з Дзенікіным была праведзена другая усерасійская мабілізацыя членаў РКСМ, а ў 1920 годзе у час барацьбы супраць легіянераў Пілсудскага, супраць засеушага у Крыме Урангеля рады Чырвонай Арміі папоўніліся моладдзю трэцяга камсамольскага прызыву.

Па умовах мабілізацый прызывалася 20 працэнтаў з ліку камсамольцаў юнакоў, фізічна годных да службы у арміі, якія дасягнулі 17 гадоў. Але на фронт прасіліся і тыя, каму было 13—14. Яны спрабавалі пераканаць камісіі, што ім «ужо роўна семнаццаць». Іменна так, школьнікам, пайшоў ваяваць чатырнаццацігадовы Аркадзь Голікаў (у будучым вядомы пісьменнік — А. Гайдар).

Ужо праз некалькі дзён пасля пачатку першай мабілізацыі чацвёртая частка камсамольцаў Масквы пайшла на барацьбу з Калчаком. З Петраграда на Усходні фронт быў адпраулен кожны пяты член РКСМ. Хто з нас не памятае па кінафільмах і кнігах стаушы легендарным надпіс на дзвярах камсамольскіх камітэтаў таго часу: «Камітэт закрыт. Усе пайшлі на фронт».

Дапамагалі Чырвонай Арміі у барацьбе супраць інтэрвентаў партызаны і падпольшчыкі, сярод якіх таксама было многа моладзі.

Не ведалі страху ў барацьбе з ворагам камсамольцы-падпольшчыкі Украіны. Яны распаусюджвалі лістоукі, ўзрывалі чыгуначныя пуці і масты, наладжвалі уцёкі з турмау арыштаваных таварышаў. Актыуна працаваў падпольны камітэт камсамола ў Адэсе: меу сваю баявую дружыну, выпускау на старонках нелегальнай партыйнай газеты «Адэскі камуніст» сваю камсамольскую старонку.

Бераўліва захоувае летапіс камсамола Беларусі імя Эдзі Займіч, першага кур'ера ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі ў мінскім падполлі. Яна была схоплена ў Мінску контрразведкай Пілсудскага. Яе страшэнна катавалі, але камсамолка нікога не выдала і загінула у беластоцкай турме.

У атрадах народных мсціуцау змагаліся сотні маладых патрыётаў. Асабліва актыуна дзейнічалі дукорскія партызаны. Многа моладзі было ў атрадах, якія змагаліся у раёне Старобін —Старыя Дарогі. Імі кіраваў малады камуніст Афанасій Паланейчык.

У летапіс гераічнай гісторыі камсамола навек увайшлі імены многіх соцень юнакоў і дзяучат, якія ваявалі за Савецкую уладу. У гады грамадзянскай вайны каля 15 тысяч мужных байцоу рэвалюцыі атрымалі вышэйшую ў той час баявую узнагароду Радзімы — ордэн Чырвонага Сцяга. І сярод іх было больш як пяць тысяч выхаванцаў камсамола. А ў 1928 годзе у азнаменаванне баявых заслуг моладзі на франтах грамадзянскай вайны камсамол быу узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга № 50104.

У агні змагання нарадзілася баявая слава РКСМ, мужнелі юнакі і дзяўчаты, якія сталі пад яго сцягі.

Не так ужо і многа часу засталося да абароны дыпломау пяцікурснікам кафедры высокамалекулярных злучэнняу хімічнага факультэта. Паспяхова працуюць над сваімі дыпломамі Н. Дзеянкова і Ю. Кузьміцкая. Тэмы сваіх работ яны выбралі яшчэ на малодшых курсах у час працы у СНТ.

Фота А. ЦЫГУЛЁВА.

ШЛЯХ Д А ПРЫЗВАННЯ

СТЫПЕНДЫЮ імя Якуба Коласа яна атрымала на трэцім курсе пасля таго, як здала толькі на «выдатна» першыя чатыры сесіі.

Так, іменна яна, Галіна Хромчанка, чацвёртакурсніца аддзялення беларускай мовы і літаратуры — адна з лепшых студэнтак філалагічнага факультэта. Здаецца, усё на дзіва проста і ясна. З дзяцінства яе цікавіла родная літаратура. Гэта вызначыла выбар шляху. Потым паступленне на філалагічны факультэт...

Але на справе усё было крыху інакш. І Галя Хромчанка расказвае аб тым, што ў характарыстыках звычайна не пішуць.

У дзесятым класе неяк так здарылася, што яна здрадзіла сваёй любві да літаратуры і мовы і захапілася... біялогіяй. Гэтаму асабліва спрыялі цікава арганізаваныя заняткі школьнага біялагічнага гуртка «Белая ружа», які Галя наведвала. І яе выбар быу безагаворачным: біяфак.

Яна нядрэнна вытрымала уступныя экзамены, добра вучылася. Але мала-памалу пераконвалася у сваёй памылцы: вучоба на біялагічным не прыносіла задавальнення. Прызнацца ў гэтым нават самой сабе было цяжка. Шкадавала страчаны час, але страшна было уявіць, што потым усё жыццё прыйдзецца займацца справаві, да якой не ляжыць сэрца. Ды і каму патрэбен спецыяліст, які не любіць сваю работу.

У летнюю сесію — не вытрымала. Здала экзамены без «троек», але адразу пасля гэтага, здзіуляючы сяброу і дэканат, пашла забіраць дакументы.

Вядома, ёй было нялёгка адразу зноу рыхтавацца да уступных экзаменау на філалагічны. Цяжка было паступіць, але і не паступіць было ужо немагчыма. І яна паступіла.

У школе Галя не была выдатніцай. Год на біяфаку вучылася добра, але таксама не выдатна. А тут захапіла яе вучоба, захапіу сам прадмет. Ніоы гэта было учора — памятае Галя самую першую лекцыю, якую вёу прафесар А. Я. Супрун. Памятае яго першыя словы: «З чаго пачынаецца Радзіма? Радзіма пачынаецца з роднай мовы...»

На лекцыі Галя хадзіла цяпер, як на свята. Гэта прыкметна адбівалася на вучобе.

І не зауважыла, як праоеглі апошнія гады.

— Галя, напэуна цяжка вучыцца чацвёрты год запар толькі на «выдатна»?

— Цяжка, але цікава. Калі б было цяжка і нудна — напэуна, не вытрымала б.

Не было б тут нічога дзіунага, калі б Галя нічым больш, акрамя вучобы, не займалася. Але ў Галі — сям'я. І гэта само па сабе ужо гаворыць, што займацца толькі вучобай у яе проста няма магчымасці. Акрамя таго, зусім нядауна яна вяла акадэмічную работу у камітэце камсамола філфака, а зараз працуе у савеце выдатнікаў факультэта. Ніколі не была у баку ад грамадскіх спрау групы, курса.

Зараз у чацвёртакурснікаў беларускага аддзялення пасіуная практыка класнага кірауніка у школах. Спяшаецца Галя кожны дзень да сваіх сямікласнікаў у 51-ю школу, імкнучыся перадаць ім кожны раз што-небудзь новае, цікавае.

— У мяне ужо зараз нярэдка пытаюцца аб планах на будучае, ці збіраюся я паступаць у аспірантуру, — расказвае Галя.

Але мне хочацца спачатку папрацаваць у школе. Гэта абавязкова трэба, каб атрыманыя тэарэтычныя веды склаліся у сістэму...

Званок. Галя спяшаецца на практычныя заняткі. Сціплая, з даверлівай усмешкай і уважлівымі вачыма — будучая настаунica.

Т. САХАШЧЫК.

НАПЕРАДЗЕ—НОВЫЯ ПОШУКІ

Амаль штодзень гарыць святло на вежы універсітэта. Нітачны прамень лазера, накіраваны адсюль у вокны навукова - даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем (НДІ ПФП), ноччу і удзень пранізвае і туман, і дымку, а перадаваемая па ім інфармацыя успрымаецца прыборамі лабараторыі перадачы і апрацоукі інфармацыі НДІ ПФП. Распрацаваная супрацоунікамі кафедры ядзернай фізікі і НДІ ПФП апаратура выкарыстоуваецца для доследнай праверкі рынцыпаў пабудовы ліній сувязі, якія у недалёкім будучым дазволяць аб'яднаць у адзін комплекс многія вылічальныя цэнтры нашай сталіцы. У параунанні са звычайнай сувяззю па правадах або па радыё аптычныя лініі дазволяць перадаваць інфармацыю больш дакладна і непараунальна хутка. Сумесныя намаганні супрацоунікаў інстытута В. А. Данілава, М. Г. Ліушыца, С. Н. Зенчанкі і супрацоунікаў кафедры Л. Н. Карэннай, В. П. Яноускага і іншых дазволілі вырашыць адну з важнейшых прыкладных задач оптаэлектронікі — перадачу тэлевізійнага адлюстравання метадамі лічбавага тэлебачання.

Год назад пры кафедры ядзернай фізікі створан сектар ядзернай электронікі. Яго супрацоўнікі вядуць даследаванні на аснове гаспадарчых дагавораў з многімі арганізацыямі краіны. Адна з такіх работ выконваецца поунасцю сіламі студэнтаў. Навуковымі кіраўнікамі сектара і студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі з'яуляюцца вядучыя супрацоунікі кафедры — прафесар С. С. Шушкевіч, доктар фізіка - матэматычных навук У. Г. Барышэускі, кандыдаты навук В. Я. Ямны, А. Н. Перцаў, А. М. Люцко, старшыя навуковыя супрацоунікі В. П. Яноускі, В. А. Сосенка і іншыя.

Спалучэнне сучаснай тэорыі ізатопных метадаў даследавання і дасягненняў электронікі дазволілі распрацаваць шэраг новых прыбораў для розных галін народнай гаспадаркі. Сярод іх — прыборы для даследавання канцэнтрацыі мікраэлементаў, прыстасаванні для імгненнага вызначэння колькасці і размераў часцінак у вадкасцях і аэразолях, прыборы для метэаралагічных даследаванняў і для вызначэння узросту геалагічных утварэнняў, звышадчувальныя фотаметрычныя прыборы і іншыя.

У лістападзе мінулага года па дагавору аб навуковым супрацоуніцтве на кафедру прыязджалі вучоныя МДУ. Іх вельмі зацікавіу радыёізатопны прыбор, распрацаваны ст. выкладчыкам У. А. Чудаковым сумесна са студэнтамі, які дазваляе імгненна у лікавай форме вызначыць уласцівасці многіх рэчываў і, на думку кірауніка праблемнай лабараторыі МДУ прафесара Г. К. Тушынскага, дасць магчымасць рабіць дакладныя прагнозы лавін і селяу, што мае вялікае гаспадарчае значэнне для горных раёнаў краіны.

Вялікую увагу аддаюць супрацоунікі кафедры і сектара пастаяннаму абнауленню вучэбных лабараторый. Пад кіраўніцтвам дацэнта В. Я. Ямнага сіламі студэнтаў, у тым ліку студэнтаў вячэрняга аддзялення, абсталявана сучасная лабараторыя лічбавай і аналогавай электроннай тэхнікі. На спецыяльных стэндах студэнты змогуць цяпер хутка збіраць розныя электронныя схемы, у тым ліку маделі спецыяльных электронных вылічальных машын для апрацоукі сігналаў у эксперыментальнай фізіцы і даследаваць іх уласцівасці.

Цяпер у лабараторыях — час напружаных даследаванняу, час апрацоукі матэрыялаў летніх экспедыцый на Далёкі Усход, Каўказ і Валожынскую базу БДУ.

Наперадзе — новыя пошукі.

М. КОМАР,
загадчык сектара ядзернай электронікі кафедры ядзернай фізікі.

НА СЯБРОЎСКАЙ ХВАЛІ

Яшчэ у лютым у політэхнічны інстытут накіраваўся «ганец» бібліятэкі БДУ запрасіць сваіх калег у госці на сустрэчу Міжнароднага жаночага дня 8 Сакавіка.

За два тыдні да гэтага дня калектыу бібліятэкі пачаў хваляваца—будуць госці.

І вось гэты дзень наступіу. Чытальная зала ператварылася у залу сустрэч і узаемных добрых пажаданняу. У баку прыхавалася хатка, дзе дзве сімпатычныя гаспадыні адорвалі гасцей і гаспадароу памятнымі сувенірамі. Прыемна, што старшыня камісіі па праверцы работы бібліятэк ВНУ рэспублікі Наталля Міхайлаука Недаступ знайшла час прыйсці і павіншаваць сваіх калег з гэтым вялікім святам.

Ад імя партбюро прысутных павіншаваў з Міжнародным жаночым днём у Міжнародны год жанчыны сакратар партбюро АХЧ Уладзімір Дзмітравіч Мухаеу.

На пляцоуцы, падрыхтаванай для выступленняў, з'яуляюцца матрошкі. Яны спяваюць жартоуныя частушкі. Кожны аддзел змог здзівіць і гасцей і гаспадароу сваімі нечаканымі талентамі. Гучаць пародыі на музыку папулярных песень. Скардзіцца на цеснату і хваліцца сваёй знаходлівасцю у сувязі з гэтым аддзел апрацоукі.

Па ініцыятыве гаспадароу загучала песня беларускіх партызан «Ой, бярозы ды сосны». Гэтай песняй віталі былую партызанскую разведчыцу, зараз дырэктара бібліятэкі політэхнічнага інстытута Еудакію Пятроуну Вераб'ёву.

Многа цёплых слоу было сказана пра нашых савецкіх жанчын. Мікрафон пераходзіу з рук у рукі, у кожнага знаходзілося незвычаина пранікнёныя і добрыя словы.

А дырэктары пасля афіцыйных прывітанняу ужо завялі паміж сабою чыста прафесійную размову: планы, справаздачы, метады работы кнігавыдачы, забяспечанасць чытачоу кнігамі.

А як здзівілися госці, калі з мікрафона загучалі галасы іх чытачоу, выкладчыка Т. Пракошкі, савецкіх і замежных студэнтаў, якія віншавалі іх са святам. Аказваецца, гаспадары падрыхтавалі сюрпрыз: яны узялі інтэрв'ю у чытачоу бібліятэкі політэхнічнага інстытута і запісалі яго на плёнку.

...Льецца палюбіушаяся песня «Травы». Але вядучая не дае панаваць лірычнаму зацішшу, і мікрафон у руках новага таленту.

І хто думаў, што бібліятэкары, гэтыя пагружаныя у паўсядзённыя клопаты жанчыны, умеюць так спяваць, складаць вершы, ад якіх закіпаюць слёзы на вачах і шчыміць сэрца, пісаць жартоуныя пародыі, што яны амаль чарауніцы, якія змаглі выпусціць да гэтай даты цікавую насценгазету, якая іскрыцца жартам і смехам, і сагрэты пяшчотай і лёгкім гумарам дадатак да газеты «Нашы дзеці».

Многа выдумкі, арганізатарскага таленту уклала у гэтую сустрэчу камісія: Т. П. Епанчынцава, Н. М. Славінская, В. С. Малашанка, Е. С. Буткевіч, Е. І. Кляуцова, Т. Л. Дудко, Л. П. Міцкевіч, Е. Е. Озерац, А. А. Пышко, Н. Бястолкава. Напэуна, не было ніводнага чалавека у бібліятэцы, які б не удзельнічаў у падрыхтоуцы гэтай сустрэчы—усе балелі за гонар свайго калектыву.

Задушэуна, вельмі прыгожа прайшла гэта сустрэча. Многае было сказана ва узаемных прывітаннях, пажаданнях, проста у гутарках.

Сустрэча удалася. Але, галоунае, яна дала магчымасць калектывам лепш і бліжэй пазнаць адзін аднаго, адкрыць новыя якасці у сваіх сяброу і калег, проста адчуць цеплыню сэрцау.

Л. ВАНЬШЫНА.

ДРУЖБА, СУПРАЦОЎНІЦТВА, БРАТЭРСТВА

Споўнілася 27 год з дня падпісання Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і узаемнай данамозе паміж СССР і Народнай Рэспублікай Балгарыяй.

●●●

У гэтыя веснавыя дні шмат клопатаў у членаў аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы БДУ. З іх дапамогай у бібліятэцы галоўнага корпуса універсітэта аформлена прыгожая кніжная выстаўка, прысвечаная дружбе двух народаў.

Выстаўка складаецца з трох раздзелаў. Першы апавядае аб жыцці і дзейнасці Г. Дзімітрова, Д. Благоева, Т. Жыўкава, увогуле, аб гісторыі балгарскай кампартыі, вытоках дружбы двух брацкіх народаў. Другі раздзел прысвечан пленным сувязям НРБ і Беларусі, трэці, шматколерны і яркі,— культуры і мастацтву Балгарыі. Тут чытач знойдзе выбраныя творы буйнейшых балгарскіх пісьменнікаў: П. Вежынава, Л. Стаянава і іншых, балгарскія казкі, вершы, нарысы па гісторыі балгарскай музыкі, шмат кніг на балгарскай мове.

●●●

Дзве юбілейныя фотавыстаўкі упрыгожылі фае трэцяга паверха галоўнага корпуса БДУ. Адна з іх аформлена да 97-й гадавіны вызвалення Балгарыі ад атаманскіх прыгнятальнікаў, другая—да 27-й гадавіны з дня падпісання Дагавору і прысвечана савецка-балгарскай дружбе.

●●●

Абноўлены стэнды і экспазіцыі у пакоі савецка-балгарскай дружбы. На паліцах — кнігі М. Шагінян, Э. Казакевіча і іншых пісьменнікаў, выдадзеныя у Балгарыі, працы выдатных дзеячоў СССР і НРБ. Студэнтамі-актывістамі аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы абноўлены усе кніжныя выстаўкі аудыторыі, аформлен куток балгарскай прэсы. Жадаючыя могуць пазнаёміцца з часопісамі «Новы час», «Кінамастацтва», «Моладзь», з падшыўкамі газет.

●●●

Зараз на факультэтах праводзяцца гутаркі і лекцыі аб дружбе і супрацоўніцтве НРБ і Савецкага Саюза, дэманструюцца дакументальныя фільмы «Георгій Дзімітроў», «Народная Рэспубліка Балгарыя», «Сафія».

●●●

На сакавіцкім рэспубліканскім семінары старшынь аддзяленняў Таварыстваў дружбы з замежнымі краінамі вялася гаворка і пра свята савецка-балгарскай дружбы; ва універсітэце нават адбылося выязное пасяджэнне семінара. Аб вопыце работы аддзялення Таварыства, выніках яго дзейнасці расказаў на пасяджэнні Д. Б. Мельцар, намеснік старшыні праўлення аддзялення. Паэт Ніл Гілевіч, член праўлення, адказаў на пытанні, звязаныя з навуковымі і літаратурнымі сувязямі НРБ і нашай рэспублікі. Аб развіцці міжнародных сувязей універсітэта увогуле паведаміў прысутным прарэктар БДУ І. П. Чэпа.

НА ЗДЫМКУ: у пакоі балгара-савецкай дружбы.

ДА 30-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

СУВЯЗІ, ГАРТАВАНЫЯ ВАЙНОЙ

ВОСЕННЮ мінулага года давялося мне быць у Алма-Аце.

Аднойчы намеснік рэдактара акруговай вайсковай газеты «Боевое знамя» палкоўнік Дзмітрый Післякоў (дарэчы, наш зямляк, беларус з Магілёўшчыны) запрасіў да сябе у кабінет.

— Ці не хацелі б вы сустрэцца з казахскімі пісьменнікамі, якія ваявалі у Беларусі?— спытаў Дзмітрый Яфімавіч.— Я магу дапамагчы у гэтым.

Так адбыліся тры нечаканыя, незапланаваныя раней, незабыўныя сустрэчы з людзьмі, якія маюць непасрэднае дачыненне і да гісторыі барацьбы з фашызмам, і да развіцця беларуска - казахскіх літаратурных сувязей.

Адзін Шарыпаў нарадзіўся у 1913 годзе у Жармінскім раёне Семіпалацінскай вобласці. Скончыў казахскі педінстытут імя Абая, працаваў настаўнікам, служыў у арміі. У самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны арганізаваў партызанскі атрад, затым з'яўляўся намеснікам камісара Другой Клятнянскай партызанскай брыгады, якая была дыслакавана ў Беларусі і дзейнічала таксама ў Смаленскай і Бранскай абласцях. Доктар філалагічных навук. Дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Ауэзава АН КазССР.

(З біяграфічнай даведкі).

Толькі прычыняю дзверы з прыбітай да іх шыльдай: «Дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Ауэзава АН КазССР», як з-за доўгага, на увесь пакой, стала досыць лёгка узнімаецца насустрач немалады гаспадар кабінета:

— Вы з Беларусі? Вельмі, вельмі рад! У мяне столькі незабыўнага звязана з беларускай зямлёй...

— Вось па Вашы успаміны я і прыйшоў, дарагі Адзій Шарыпавіч.

— Я ужо нямала расказаў пра сваё партызанскае юнацтва у беларускіх лясах. «Дачка партызана», «Агонь у лесе», «Адплата», «Зоркі у цямніцы», «Гісторыя аднаго кажуха» — у кожнай з гэтых аповесцей адкладліся вопыт, думкі, эмоцыі тых далёкіх дзён. Аднак з кожным годам зноў і зноў пераконваюся: гэта такая крыніца, якую нічым не вычарпаеш. Зараз пішу дылогію «Я — сын народа», першы том рамана напісан. Гэта— таксама пра тыя далёкія па часе, але блізкія сэрцу падзеі, пра тое, як мы ваявалі, як пускалі пад адхон варожыя эшалоны, пра баявое брацтва, дружбу народаў, вернасць камуністычным ідэалам... Я—прыхільнік мастацка - дакументальнага жанра...

Былы настаўнік Адзій Шарыпаў служыў у перадваенным годзе у Ваўкавыску і Пружанах, але вайна застала яго яшчэ далей на захадзе.

Трапіўшы ў акружэнне, малодшы лейтэнант — а яму толькі-толькі прысвоілі гэта званне — з 12 салдатамі пачаў прабірацца на усход. «Я усю Беларусь нагамі вымераў», — гаворыць Адзій Шарыпавіч. І гэта не перабольшанне. Баранавічы, Стоўбцы, Мінск, Барысаў, Лепель, Талачын, Коханава, Шклоў, Прапойск, Чавусы, Чэрыкаў, Крычаў, Клімавічы — вось толькі галоўныя «знакі- арыенціры» таго доўгага, далека не простага шляху на усход, якім прабіваліся раненыя, змучаныя савецкія байцы. Па дарозе уступалі у бой з невялікімі групамі фашыстаў. А ў раёне Крычава яшчэ у верасні 1941 года пусцілі пад адхон і першы фашысцкі эшалон, які вёз на фронт боепрыпасы.

На усходзе Беларусі, у магілёўскіх лясах, да групы савецкіх салдат далучыліся беларускія сяляне. Паступова пад камандай казаха Адзія Шарыпава склаўся адзін з першых партызанскіх атрадаў Беларусі. З кожным днём партызан станавілася больш, усё новыя людзі уключаліся у актыўную барацьбу з фашызмам. Ствараюцца партызанскія брыгады. Шарыпава прызначаюць намеснікам камісара Другой Клятнянскай партызанскай брыгады, якая дзейнічала у Краснапольскім і Хоцімскім раёнах Магілёўскай вобласці і Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці.

— Партызаны жорстка помсцілі фашыстам за кроў савецкіх людзей, — прыгадвае Адзій Шарыпавіч.— Помніцца як зараз: 22 красавіка 1943 года мы узарвалі мост праз раку Бесядзь каля станцыі Бялынкавічы і на 27 сутак спынілі рух па чыгунцы. І гэта у час узмоцненай падрыхтоўкі фашыстаў да наступлення на Арлоўска - Курскім напрамку. А колькі кіламетраў рэек, тэлеграфных і тэлефонных слупоў, колькі мастоў узарвалі мы на чыгунцы Крычаў — Унеча у час памятнай «рэйкавай вайны»!

Адзін Шарыпавіч ажыўляецца. Вочы пачынаюць блішчэць... Ён зараз зноў перажывае незабыўныя дні свайго баявога юнацтва.

— Асабліва хачу адзначыць, — працягвае ён,—гераізм, патрыятызм беларускага народа, яго адданасць Савецкай уладзе.

Мы, прадстаўнікі розных народаў, увесь час адчувалі цеплыню і падтрымку мясцовага насельніцтва. Беларускія сяляне на лодцы пераправілі нас праз Беразіну і Днепр у час нашага адступлення на усход. У снежні 1941 г. я быў паранен— фашысцкая куля прабіла лёгкае. Сялянская сям'я ў беларускай вёсцы Лузганкі паставіла мяне на ногі: некалькі тыдняў я адлежваўся ў хляве — далей ад варожага вока. Мяне кармілі, мне даставалі неабходныя лекі.

Нягледзячы на тое, што самім не было чаго есці, заусёды, ва усіх вёсках, куды мы заходзілі, сустракалі нас з радасцю. «Зайдзіце у хату, паешце, вы ужо, бачу, некалькі дзён не елі, а я пайду пагляджу, каб немцы часам не наляцелі»,— гэтыя словы я нават зараз помню ў беларускім гучанні, настолькі часта мы іх чулі. Гэта падтрымка аказвала на нас, партызан, вялікі маральны уплыў.

Адзій Шарыпавіч змагаўся у Беларусі з першага і да апошняга дня яе акупацыі. У канцы красавіка 1944 года яго выклікалі ў Цэнтральны штаб партызанскага руху, які ўзначальваў сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. К. Панамарэнка.

— Панамарэнка сказаў мне: «Вы ужо сваё адваявалі, едзьце ў ваш родны Казахстан наладжваць мірнае жыццё». Да гэтага часу ў мяне захоўваецца падпісаная начальнікам Цэнтральнага штаба партызанскага руху характарыстыка, дзе сказана, што я — адзін з першых арганізатараў партызанскага руху ў Беларусі. Гэта самы памятны і дарагі для мяне дакумент.

Пасля вайны Адзій Шарыпавіч Шарыпаў працаваў намеснікам Старшыні Савета Міністраў рэспублікі, міністрам замежных спраў Казахскай ССР. Неаднойчы абіраўся членам ЦК Кампартыі, дэпутатам Вярхоўнага Савета Казахстана.

Вялікую і складаную дзяржаўную і грамадскую дзейнасць Адзій Шарыпавіч заусёды спалучаў з літаратурнай і навуковай працай. Ён абараняе кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, становіцца вядомым казахскім пісьменнікам.

Застаецца дадаць, што беларускі партызан узнагароджан ордэнам Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак пашаны», многімі медалямі.

— Скажыце, Адзін Шарыпавіч,— задаю апошняе пытанне,— ці падтрымліваеце Вы сувязь з той зямлёй, на якой ваявалі?

— У Беларусі я быў пасля вайны двойчы: у 1949 і ў 1959 гадах, на святкаванні 30-годдзя і 40-годдзя БССР. У 1949 годзе ездзілі ў Мінск з Габідам Мусрэпавым, зараз Героем Сацыялістычнай Працы, хадзілі ў госці да Якуба Коласа... Я увесь час перапісваўся з былым камандзірам нашай партызанскай брыгады Каротчанкам, камісарам батальёна Ялюхіным.

З пісьменнікаў я даўно сябрую з Петрусём Броўкам і Максімам Танкам.

У гутарцы незаўважна праляцелі паўтары гадзіны. Час развітвацца.

— Перадайце прывітанне Беларусі!

— Абавязкова! — абяцаю я.

(Працяг будзе).

В. РАГОЙША.

Сёння на абанеменце навуковай і мастацкай літаратуры працуюць ст. бібліятэкар С. В. Елькіна (справа) і бібліятэкар В. Уткіна.

ТУРБОТЫ КУРАТАРА

Работа куратара у групе — вельмі складаная і цікавая. І самая прадукцыйная, карысная яна тады, калі працуеш са студэнтамі адной групы на працягу усёй вучобы іх ва універсітэце. Праўда, ажыццявіць гэта на нашым факультэце немагчыма, так як у канцы другога курса фарміруюцца новыя групы у сувязі з размеркаваннем студэнтаў па спецыяльнасцях. Таму даводзіцца кожны год знаёміцца з новай групай, з якой нават не вядзеш ніякіх заняткаў. Гэта таксама ускладняе работу. Куратару трэба скласці пэўную думку пра студэнта, пра яго адносіны да вучобы. Цяжка прасачыць за тым, як студэнты працуюць на працягу года, каму неабходна дапамога.

Некалькі разоў я была куратарам групы, у якой у мяне не было заняткаў. Каб паглядзець, як студэнты працуюць на працягу семестра, наведвала заняткі іншых выкладчыкаў. Аднойчы мне паскардзіліся, што у групе дрэнная падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў па гісторыі КПСС. Мы абмеркавалі гэта пытанне у групе, і я абяцала сама пабываць на занятках. У час майго наведання семінара актыўнасць была вельмі добрая. І, наогул, заняткі мне вельмі спадабаліся. Толькі потым выявілася, што студэнты чакалі майго прыходу і спецыяльна да яго рыхтаваліся. Так што ўяўленне аб групе, а тым больш аб кожным студэнце проста немагчыма скласці толькі па нечых словах і па выбарачных праверках.

Другое пытанне, як ужо адзначалася, тое, што кожны год нам даводзіцца браць новыя групы. І вельмі шкада, калі ў канцы гэтага ж года трэба расставацца з рабятамі, з якімі толькі паспееш пасябраваць, якія толькі пачалі давяраць табе, дзяліцца з табой сваімі нягодамі, сваімі радасцямі і цяжкасцямі. Замена куратара кожны год, па-мойму, неспрыяльна адбіваецца і на рабоце групы.

М. ХОМІЧ,
старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі.

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА АГЛЯДУ!

ПАЛАЖЭННЕ АБ АГЛЯДЗЕ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ФАКУЛЬТЭТАЎ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Мэта агляду — далейшае развіццё мастацкай самадзейнасці, павышэнне майстэрства выканаўцаў усіх жанраў і відаў самадзейнага мастацтва, паляпшэнне эстэтычнага выхавання савецкага студэнта, прапаганда ў мастацкай форме перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі, гістарычных перамог, заваяваных савецкім народам пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі.

Агляд прысвячаецца 30-годдзю Перамогі савецкага народа над фашызмам.

Арганізатарамі агляду з'яўляюцца: рэктарат, партком, камітэт камсамола, мясцком, прафком і праўленне студэнцкага клуба.

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіць арганізацыйны камітэт у наступным саставе: А. Я. Малышаў (старшыня), прарэктар па вучэбнай рабоце; С. А. Лысенка (намеснік старшыні), член парткома; У. А. Навумовіч, сакратар камітэта камсамола БДУ; І. Г. Родзін, старшыня мясцкома; У. І. Герасіменка, старшыня праўлення клуба; Я. В. Скварчэўскі, мастацкі кіраўнік самадзеінасці універсітэта.

У журы агляду увахо-дзяць кіраўнікі народных калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта, а таксама прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Журы вызначае тры першыя месцы па лепшай суме балаў. Нумары праграмы канцэртаў мастацкай самадзейнасці ацэньваюцца журы па 10-бальнай сістэме. Журы мае права здымаць ад і да 5 балаў за нумары, якія не вызначаюцца высокім ідэйным і мастацкім узроўнем.

Пры падвядзенні вынікаў журы будзе улічваць тэматыку твораў, выканаўчае майстэрства, масавасць і сцэнічную культуру удзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Адзін з галоўных паказчыкаў пры падвядзенні вынікаў агляду — сума балаў, якія факультэт атрымае за лепшыя 15 нумароў праграмы.

Ацэньваючы мастацкі узровень выканання, журы звяртае ўвагу на сцэнічную культуру і дысцыпліну удзельнікаў агляду.

Журы мае права заахвоціць факультэт (ад 5 да 10 балаў) за добрае сцэнічнае рашэнне канцэртнай праграмы.

Рашэнне журы аб'яўляецца на заключным канцэрце 12 красавіка 1975 года.

Састаў журы: старшыня— С. А. Лысенка, член парткома. Намеснік старшыні — А. М. Озераў, заслужаны артыст Латвійскай ССР.

Члены: М. А. Лісіцын, заслужаны работнік культуры БССР; М. В. Лапша, кіраўнік народнага ансамбля танца «Крыжачок»; А. В. Рашчынскі, кіраўнік народнай харавой капэлы універсітэта; У. І. Навумовіч, сакратар камітэта камсамола універсітэта; У. І. Герасіменка, старшыня праўлення клуба; Т. Д. Арлова, кандыдат мастацтвазнаўчых навук; Г. Г. Герасіменка, дацэнт кафедры гісторыі КПСС; Ю. С. Шынкар, член камітэта камсамола.

Месца і час

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіцца у актавай зале галоўнага корпуса у наступныя тэрміны:

2 красавіка ў 19.00 — гістфак; у 20.30 — філфак;

3 красавіка у 19.00— хімфак, у 20.30 — геафак;

4 красавіка ў 19.00 — ФПМ, у 20.30 — фізфак;

5 красавіка у 19.00 — юрфак, у 20.30 — матфак;

7 красавіка у 19.00 —журфак, у 20.30 — біяфак.

Удзел у аглядзе і яго умовы:

У аглядзе могуць прымаць удзел студэнты стацыянарнага, вячэрняга і завочнага навучання, аспіранты і выкладчыкі.

Факультэту прадастаўляецца права правесці рэпетыцыю ў актавай зале непасрэдна ў дзень агляду працягласцю не болей дзвюх гадзін.

У час агляду факультэты паказваюць паўтарагадзінную праграму. Кожны факультэт павінен як мага шырэй ахапіць розныя жанры і формы самадзейнага мастацтва: вакальныя ансамблі, танцавальныя групы, індывідуальныя выканаўцы, мастацкае чытанне, народныя і эстрадныя аркестры і ансамблі, выканаўцы-інструменталісты (фартэпіяна, скрыпка, народныя інструменты), пантаміма і інш. Кожны саліст мае права выканаць не больш двух твораў.

Для кожнага жанра ўстанаўліваюцца 3 першыя месцы, за якія факультэты атрымліваюць дадатковыя балы:

харавыя калектывы:
I месца — 30 балаў
II месца — 20 балаў
III месца — 10 балаў

ансамблі, дуэты, трыо:
I месца — 20 балаў
II месца — 15 балаў
III месца — 10 балаў

салісты:
I месца — 15 балаў
II месца — 10 балаў
III месца — 5 балаў

Праграмы канцэрта неабходна прадставіць у праўленне клуба не пазней 28 сакавіка ў 10 экземплярах, з указаннем імя і прозвішча аутарау і выканаўцаў.

Узнагароджанне

Калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта, які заняў першае месца, узнагароджваецца Ганаровай граматай і грашовай прэміяй.

Калектывы, якія зоймуць другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі і грашовымі прэміямі.

Установлены спецыяльныя прызы: за масавасць, за лепшае выкананне патрыятычнай песні, лепшаму дэкламатару, лепшаму танцору, лепшаму салісту-вакалісту.

АРГКАМІТЭТ.

АРТЫСТЫ ГЕАФАКА

ЯШЧЭ два гады назад пра мастацкую самадзейнасць на геафаку асаблівая слава не ішла. Як і на іншых факультэтах, студэнты рыхтаваліся да аглядаў, крыху спявалі, крыху танцавалі.

— Але нам хацелася большага,—гаворыць дацэнт кафедры гісторыі КПСС Н. П. Хрыпко. Вось ужо 10 гадоў кіруе яна мастацкай самадзейнасцю на геафаку. «Душа калектыву», — гавораць пра яе артысты.

Калі вядучая канцэртных праграм Валя Мяшчэрская аб'яўляе той ці іншы нумар праграмы, Надзея Паулаўна хвалюецца не менш, чым сам выступаючы.

Цёпла сустракаюць гледачы выступленні салістаў Віктара Махоускага, Таццяны Котавай, Таццяны Крэсік, Ірыны Ляпёшкінай.

Як сказала сама Іра, сваё другое прызванне (першае, вядома, геаграфія) знайшла яна у самадзейнасці. Лірычнасць і лёгкасць успрымання, натхненне і задушэўнасць — усё гэта дзяючына даносіць да слухачоў.

Сёння гордасць факультэта — танцавальная група. І каб уявіць сабе гэта лепш, трэба адзначыць, што ужо два гады запар гэта група займае першае месца сярод танцавальных калектываў БДУ. 24 чалавекі уваходзяць у яе, касцяк складаюць М. Кораб, А. Касабуцкі, Ю. Грамакоускі, Т. Навуменка, К. Гародка. Усе яны танцуюць ва універсітэцкім «Крыжачку».

— Добрыя рабяты, ноччу ўзнімі — станцуюць, — гаворыць жартам Надзея Паулаўна Хрыпко.

Яна добра ведае кожнага з артыстаў і таму упэўнена, што у гэтых хлопцаў энергіі і фантазіі хопіць на усё жыццё.

Нямала трэба патраціць сіл і часу, каб самім паставіць танец. Але можа таму так лёгка і ўспрымаюцца іх танцы, што у кожным закладзена часцінка душы выканаўцаў. Імклівасць рытму, лёгкасць выканання спалучаюцца з настроем танцорау і гледачоў.

І калі вядучая аб'яўляе танцы «Скамарохі», «Каламійка» — гучныя апладысменты сустракаюць артыстаў. І тады... трымайцеся, падлога і чаравікі, захапляйцеся, гледачы!

Часта на рэпетыцыі, на выступленні танцавальнай групы заглядвае кіраунік «Крыжачка» М. В. Лапша. Надзея Паулаўна расказала, як ён аднойчы пажартаваў: «Ой, баюся я, што вы хутка выцесніце наш «Крыжачок».

— А мы не прэтэндуем на вялікую славу, хаця... той, не салдат, хто не марыць стаць генералам, — усміхаецца кіраунік мастацкай самадзейнасці геафака.

Гэта пра танцавальны калектыу, але хор таксама патрэбен факультэту. І сёння ужо Н. П. Хрыпко прыкладае усе намаганні на яго арганізацыю. Пакуль цяжка ўцягнуць у мастацкую самадзейнасць першакурснікаў. Надзея Паулаўна усё ж спадзяецца, што і яны не застануцца у баку ад спрау факультэта.

Л. МАРОЗ,
студэнтка вячэрняга аддзялення журфака.

ФАРБЫ САКАВІТЫЯ, ДУШЭЎНЫЯ.

Аматару жывапісу добра знаёмы Палац мастацтвау. Здаецца, зусім нядауна у яго залах глядач любаваўся вялікай калекцыяй акварэлі рэспублікі або жывапіснымі работамі асенняй рэспубліканскай выстаукі.

Сёння палац поунцца новымі экспазіцыямі.

Мастак-паэт, мастак-франтавік Віктар Сахненка вядомы нам у асноуным як майстар партрэтнага жывапісу. На выстауцы творау мастака у палацы значная колькасць работ выканана іменна у гэтым плане. Тут і «Партрэт народнага мастака БССР М. Савіцкага», і «Партрэт калгасніцы», і камбайнера, цялятніцы, студэнта. Індывідуальны Сахненка і у нацюрморце.

Другі паверх палаца часткова занят работамі заслужанага дзеяча мастацтвау БССР Паула Масленікава, часткова — перасоунай выстаукай жывапісу і скульптуры, якая арганізавана Саюзам мастакоу СССР.

Выстаука расказвае аб творчым пошуку мастакоу розных пакаленняу і розных геаграфічных шырот: Расіі, Прыбалтыкі, Сярэдняй Азіі і Закауказзя.

Канешне, самыя галоуныя экспанаты выстаукі — творы народных мастакоу СССР Б. Іагансана і А. Дайнекі. Чырвоны колер з мноствам паутаноу і адценняу нібыта магнітам прыцягвае позірк. Гэта карціна Іагансана «Ленін». Зусім іншыя — яркія, сонечныя, кантрасныя—фарбы у Дайнекі, што асабліва бачна у творы «На поуначы».

З іншых трэба адзначыць трыпціх Л. Дзюфана «Адэса, мой горад». Адкрыццё новай прыгажосці жыцця, хвалюючай паэзіі сучаснасці ёсць у работах Г. Небажаткі («Партрэт хірурга Амосава») і А. Мыльнікава («У садзе»), асобая публіцыстычнасць уласціва серыі П. Асоускага «Рубяжы жыцця Радзімы». Увогуле добрых работ вельмі многа.

Выстаука П. Масленікава прысвечана 60-годдзю з дня яго нараджэння.

Масленікау — пейзажыст. «Я заўсёды невымерна хвалююся перад цудоунай прыродай як перад магутным тэлескопам — акном у неразгаданае», — гаворыць мастак.

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.



Цырк. Каго не вабіць ён прыгажосцю, смеласцю, лоўкасцю, вялікім майстэрствам сваіх артыстаў!

НА ЗДЫМКАХ: выступаюць жанглёры; нумар дрэсіраваных сабачак Маргарыты Шчалчковай.

СПАРТЫЎНЫЯ НАВІНЫ

У канцы лютага у раёне станцыі «Зялёнае» праходзіла асабіста-камандная першынство універсітэта па лыжнаму спорту. 154 чалавекі з усіх факультэтаў аспрэчвалі прызавыя месцы. Пераможцай на дыстанцыі 5 км стала студэнтка геафака Яўгенія Рашкевіч (28 мін. 26 сек.), на 3 км — студэнтка юрфака Тамара Кацар (14 мін. 56 сек).

У мужчын у гонцы на 5 км перамог інжынер НДС Анатоль Паўлау (15 мін. 41 сек.), на дыстанцыі 10 км — студэнт гістфака Пётр Хадасевіч (32 мін. 47 сек.).

У камандным заліку: хімічны факультэт — 1 месца, матэматычны факультэт — 2 месца, юрыдычны факультэт — 3 месца.

38 чалавек выканалі нарматывы II спартыўнага разраду і 21 чалавек — III спартыўнага разраду па лыжах.

***

10 сакавіка закончылася першынство універсітэта па шахматах. Першае месца заняла каманда матфака, 2— ФПМ, 3— хімфака.

***

12—13 сакавіка адбылося першынство універсітэта па лёгкай атлетыцы у зімовых умовах з удзелам больш як 300 чалавек. Пасля падвядзення вынікаў 1—2 месцы падзялілі гістфак і ФПМ, на 3 месцы — фізфак.

Студэнт фізфака Вячаслаў Арлоў устанавіў вышэйшае дасягненне БДУ у прыжках у вышыню — 2 метры.

М. ШЭЙНЕМАН.

Дэканат, партбюро, прафбюро, камітэт камсамола, супрацоунікі і студэнты біялагічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці студэнта I курса Сяргея КАРЖАНЦЭЎСКАГА і выказваюць спачуванне родным памёршага.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Аб'ём — 1 друк. ар.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19

Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2 000 экз. АТ 06562. Заказ № 482